# ТВОРЧАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ КАТАЛІЦКІХ СВЯТАРОЎ У КАНТЭКСЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ

**Біруля Кацярына Вячаславаўна**
аспірант кафедры беларускай літаратуры і культуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (г. Мінск, Беларусь)

Творчасць беларускіх каталіцкіх святароў – яркая старонка ў гісторыі айчыннай літаратуры. Канстанцін Стэповіч (псеўданім – Казімір Сваяк), Аляксандр Астрамовіч (псеўданім – Андрэй Зязюля), Язэп Германовіч



архив библиотеки МГУ имени А

(псеўданім – Вінцук Адважны) – не толькі святары, але і выдатныя майстры слова. Не заўважаныя і не ацэненыя ў свой час па розных прычынах (палітычных, рэлігійных, сацыяльных), сёння іх таленты ўстаюць перад намі ў поўнай велічы. Творчасць святароў – арганічная частка літаратурнага працэсу. Іх творы надаюць багацце беларускай літаратуры на сюжэтна-тэматычным узроўні.

На творчасць беларускіх каталіцкіх святароў наклаў адбітак перыяд нацыянальнага Адраджэння. У гэты час пачалі тварыць выдатныя майстры беларускай літаратуры Я. Колас, Я. Купала, М. Багдановіч і інш., наладжвалася выдавецкая справа, праводзілася культурна-асветніцкая праца. Святары, дзе паэтычным словам, а дзе касцёльнай навукай таксама далучыліся да гэтага працэсу. Аднак нельга забываць і пра тую акалічнасць, што згаданыя К. Стэповіч, А. Астрамовіч, Я. Германовіч працавалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, дзе быў свой грамадска-палітычны лад. Сёння літаратуразнаўцы адносяць іх творчасць да літаратуры Заходняй Беларусі. У прыватнасці даследчык М. Мікуліч вылучае тры плыні ў заходнебеларускай паэзіі – лірыка-апавядальную, рамантычную і духоўна-ірацыянальную, кожная з якіх прадугледжвала той ці іншы тып асобы лірычнага героя, яго светаўспрымання і мыслення, арыентацыю на пэўнае кола жыццёвых каштоўнасцей і прыярытэтаў, духоўна-эстэтычных каардынат і крытэрыяў [3, с. 59]. Менавіта да духоўна-ірацыянальнай плыні ён адносіць творчасць К. Стэповіча, Я. Германовіча, А. Астрамовіча і інш.

Духоўных асоб не маглі не хваляваць дзяржаўныя працэсы, што адбываліся ў краіне. Першая сусветная вайна, рэвалюцыі (Кастрычніцкая і Лютаўская 1917 г), звяржэнне самадзяржаўя, падзел на Усходнюю і Заходнюю Беларусь – гэтыя падзеі паўплывалі на ўсю беларускай літаратуру, сталі крыніцай новых тэм і вобразаў. Пісьменнікі-святары паходзілі пераважна з заходніх частак Гродзеншчыны, дзе адчувалася моцная каталіцкая традыцыя. Нягледзячы на моцны ўплыў з боку Польшчы, сярод святароў пачынае выспяваць рух за беларускае Адраджэнне, якое закранула ўсе сферы жыцця, у тым ліку не абмінула і рэлігійную. Беларускія святары змагаліся за ўвядзенне беларускай мовы ў набажэнствы, у адукацыю. К. Стэповіч, А. Астрамовіч, Я. Германовіч, В. Гадлеўскі, А. Станкевіч і інш. робяць першыя спробы чытаць казанні падчас Святой імшы па-беларуску.

Важную ролю ў падрыхтоўцы нацыянальна свядомых святароў адыгралі рэлігійныя навучальныя ўстановы – Віленская духоўная семінарыя і Пецярбургская духоўная семінарыя і акадэмія. Менавіта адтуль святары выходзілі палымянымі патрыётамі беларушчыны. В.В. Грыгор'ева ў кнізе "Канфесіі на Беларусі" адзначае: "Цікава, што цэнтрам, дзе сярод каталіцкага духавенства зараджаўся і выспяваў рух за беларускае адраджэнне, стаў Пецярбург. Гэта тлумачыцца тым, што менавіта тут, у Пецярбургскай духоўнай акадэміі і Духоўнай каталіцкай семінарыі, рыхтаваліся галоўным чынам кадры для касцёлаў беларускіх губерняў" [2, с. 128]. У гэтых навучальных установах праходзіла станаўленне светапогляду святароў, навучанне духоўным практыкам. Тут выспявала ў іх любоў да Бога і бліжняга, да роднага краю.

Айцец А. Надсан, вывучаючы пытанне духоўнай адукацыі і беларускага нацыянальнага руху, адзначаў, што ў Віленскай семінарыі панаваў польскі дух,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

таму беларускі рух не мог быць спатканы прыхільна: “Усё ж, нягледзячы на цяжкасці, у першым дзесяцігоддзі XX ст. з гэтай установы выйшла некалькі выдатных беларускіх святароў, сярод якіх Ян Семашкевіч (паэт Янка Быліна) і Уладзіслаў Талочка. Становішча папраўілася, калі ў 1910 г. у семінарыю прыйшоў Адам Станкевіч, ужо тады свядомы беларус. Праз год яму ўдалося зарганізаваць сярод семінарыстаў беларускі гурток і дабіцца, каб яго прызналі семінарыйныя ўлады. Да гуртка належалі такія вядомыя беларускія святары, як Язэп Рэшаць, Канстанцін Стэповіч (паэт Казімір Сваяк), Язэп Дашута, Андрэй Цікота і інш.” [4, с. 177].

Пецярбургская духоўная акадэмія на той час была адзінай каталіцкай акадэміяй ва ўсёй Расійскай імперыі. Тут вучыліся вядомыя святары Аляксандр Астрамовіч і Францішак Будзька. Менавіта ў Пецярбургскай духоўнай акадэміі грэцкую мову выкладаў Браніслаў ігнатавіч Эпімах-Шыпіла, які адыграў вялікую ролю ў беларускім нацыянальным Адраджэнні. Даследчыца І. Багдановіч адзначае, што “ён быў нібы жывы масток паміж чвэрцю XIX ст. – Багушэвічавым перыядам адраджэння і пачаткам XX ст. – новым нашаніўскім этапам” [1, с. 48]. Высока ацаніў постаць Б. Эпімах-Шыпілы Адам Станкевіч: “Вобак з Ф. Багушэвічам гэта першы піянер беларускага адраджэння, апостал беларускага народу, апякун беларускай моладзі, ідэёвы працаўнік на ніве беларускай нацыянальнай і рэлігійнай культуры, гарачы патрыёт, тварэц у беларускім адраджэнні пары “Загляне сонца і ў наша ваконца”, або пары шыпілаўскай, якая папярэдзіла пару нашаніўскую” [5, с. 470].

У 1913 г. выходзіць зборнік паэзіі ксяндза Аляксандра Астрамовіча “З роднага загону”, у 1924 г. – “Мая ліра” ксяндза Кастуся Стэповіча, у 1933 г. – “Беларускія цымбалы” айца Язэпа Германовіча. Гэтыя кнігі багатыя хрысціянскай вобразнасцю і сімволікай, маральна-этычныя паводле зместу. Усе зборнікі прасякнуты ярка выражаным адраджэнскім пафасам.

У перыяд з 1913 па 1915 год у Вільні пачынае выходзіць газета “Biełarus”, асноўнай мэтай якой была беларуская справа. На старонках газеты часта друкаваліся мастацкія творы святароў. Займалася рэдакцыя і выданнем кніг. Напрыклад, былі выдадзены кніга “Алкаголь” ксяндза К. Стэповіча, зборнік “З роднага загону” ксяндза А. Астрамовіча і інш. Газета адыграла вялікую ролю ў гісторыі беларускага каталіцкага друку і наогул у гісторыі перыёдыкі ў Беларусі.

Такім чынам, асветніцкая дзейнасць беларускіх каталіцкіх святароў займае адметнае месца ў культурна-грамадскім жыцці Беларусі ў перыяд нацыянальнага Адраджэння. Вывучэнне і асэнсаванне іх творчасці дае магчымасць па-новаму інтэрпрэтаваць як культурна-гістарычныя рэаліі, так і мастацкую вартасць літаратуры пэўных перыядаў.

**Літаратура**

1. Багдановіч, І. Э. Авангард і традыцыя: Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / і. Э. Багдановіч. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 387 с.
2. Грыгор’ева, В. В. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX ст.) / В. В. Грыгор’ева, У. М. Завальнюк, У. І. Навіцкі ; пад. рэд. У. І. Навіцкага. – Мінск : Эксперспектыва, 1998. – 340 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

3. Мікуліч, М. У. Паэзія Заходняй Беларусі (1921–1939) / М. У. Мікуліч. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 462 с.
4. Надсан, А. Выбранае / А. Надсан; уклад., і камент. І. Багдановіч, прадм. Л. Савік. – Мінск : Кнігазбор, 2014. – 608 с.
5. Станкевіч, А. З Богам да Беларусі : збор твораў / А. Станкевіч. – Вільня : інстытут беларусісційкі, 2008. – 1098 с.